Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

10 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 193 (27803) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**



За чый кошт можна адрамантаваць пад'езд

СТАР. 4



Беларусы збіраюць памятныя рэчы Другой сусветнай

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**17 праектаў**

*дакументаў, накіраваных на далейшае развіццё міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў гуманітарнай галіне, у галіне забеспячэння бяспекі і іншых сферах, вынесены на парадак дня пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, якое адбудзецца сёння ў Мінску. Таксама сёння ў беларускай сталіцы адбудуцца пасяджэнні Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці і Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10640,00 | ▲ |
| Еўра | 13580,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 266,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 821,62 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Вабіць фарэллю «Вабіч»

**У ПМК-83 «Вадбуд», што ў Бялыніцкім раёне Магілёўшчыны, гаспадарка спраўная. Пабудавалі базу адпачынку «Вабіч», дзе ў двухпавярховых дыхтоўных доміках можна выдатна правесці вольны час з сям'ёй або кампаніяй, выкапалі сажалкі, у якіх пасялілі карпа, амура, шчупака і нават далікатэсную фарэль. Цяпер госці могуць не толькі купіць свежую жывую рыбу, але і пасядзець з вудай каля вады. Дырэктар прадпрыемства Андрэй ЦАРЫКАЎ і галоўны рыбавод Міхаіл ШКОЛЬНІКАЎ рыбным «статкам» задаволеныя: хопіць і на продаж, і турыстам.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

■ Падзея

## ДАГАВОР АБ ЕАЭС РАТЫФІКАВАНЫ

### А падатковы манеўр Беларусі кампенсуюць

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон аб ратыфікацыі дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе.**

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КАБЯКОЎ** звяртае ўвагу на тое, што ў тэксце падпісанага закона цалкам змешчана заява, якую рабіў беларускі лідар яшчэ 29 мая ў Астане. Сутнасць заявы ў тым, што Беларусь будзе добрасумленна выконваць свае абавязацельствы ў межах дагавора і прадпрыме іншыя захады па яго рэалізацыі пры ўмове, што да гэтага моманту будуць дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці аб зняцці бар'ераў, абмежаванняў, выключэнняў у гандлі асобнымі таварамі і аказанні асобных відаў паслуг, у першую чаргу ў дачыненні да энерганосьбітаў. І нашы заканадаўцы паўтарылі гэтую заяву падчас ратыфікацыі. «Справа ў тым, што ў працэсе падрыхтоўкі дагавора аб ЕАЭС дамовіліся, што да 2025 года будуць захоўвацца тыя ці іншыя адчувальныя для бакоў выключэнні і абмежаванні ў гандлі. Усё гэта было строга абумоўлена. Памер самага адчувальнага для Беларусі выключэння па вуглевадародах ва ўмовах 2014 года складае каля 3,3 млрд долараў. Гэта аб'ём вывазных мытных пошлін на нафтапрадукты, якія мы прадаём на экспарт»,— паведаміў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама нагадаў, што яшчэ ў 2010 годзе пры стварэнні Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы было дамоўлена, што ўсе вывазныя мытныя пошліны ад экспарту нафтапрадуктаў, якія выраблены з расійскай нафты, будуць пералічвацца ў бюджэт Расійскай Федэрацыі.

СТАР. 2

■ Прафесійная школа

## ДАРАГІЯ РАБОЧЫЯ РУКІ...

**Як сведчаць вынікі апытання, праведзенага Навукова-даследчым інстытутам працы ў арганізацыях розных формаў уласнасці, больш за 65% з іх адчуваюць дэфіцыт кадраў рабочых і служачых.**

— На жаль, рынак працы яшчэ не стаў прамым заказчыкам прафесіянальных адукацыйных паслуг, у выніку чаго марудна скарачаецца дыстанцыя паміж попытам рынку працы на кадры і прапановамі прафесійнай адукацыі,— паведаміў на калегіі Міністэрства адукацыі, прысвечанай падрыхтоўцы кадраў з прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.** — У прагназаванні патрэб практычна не ўдзельнічаюць арганізацыі малога і сярэдняга бізнесу. І заказы на падрыхтоўку кадраў не адлюстроўваюць патрэбы ў новых кваліфікацыях. Фактычна адсутнічаюць заяўкі на падрыхтоўку рэдкіх і малакалькасных прафесій.

СТАР. 3



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# «ДАРОЖНАЯ КАРТА» НА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

## У Беларусі і Туркменістана новыя ўзаемавыгадныя кірункі сумеснай работы

**Візіт Прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава адкрыў новыя перспектывы супрацоўніцтва нашых дзвюх краін. Недзарма, падводзячы вынікі перагавораў са сваім туркменскім калегам, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў іх прадуктыўны і прадметны характар. «Для Беларусі Туркменістан з'яўляецца адным са стратэгічных партнёраў у Цэнтральнай Азіі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Упэўнены, што дасягнутыя падчас сустрэчы дамоўленасці і падпісаныя дакументы будуць садзейнічаць умацаванню спрыяльнай атмасферы нашага супрацоўніцтва, пашырэнню дагаворна-прававой базы міждзяржаўных адносін».**

Па выніках перамоў быў падпісаны пакет з 14 дакументаў, якія пашыраюць узаемадзеянне ў прамысловай, гуманітарнай сферах, а таксама паміж рэгіёнамі. У прыватнасці, прэзідэнты падпісалі сумесную заяву, у якой адзначылі важнае значэнне развіцця і паглыблення палітычнага дыялогу паміж дзвюма краінамі, умацавання міжпарламенцкіх сувязяў, гандлёва-эканамічных адносін, а таксама пашырэння дагаворна-прававой базы двухбаковага супрацоўніцтва. Кіраўнікі дзяржаў паставілі подпісы пад пагадненнем аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў галіне паставак беларускай сельскагаспадарчай, аўтамабільнай, дарожна-будаўнічай, камунальнай і пасажырскай тэхнікі.

Падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж урадамі дзвюх краін аб асноўных прынцыпах супрацоўніцтва ў галіне транспарту, міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне папярэджання надзвычайных сітуацый і ліквідацыі іх наступстваў. Урады таксама прынялі праграму супрацоўніцтва ў галіне культуры і мастацтва на 2015-2016 гады.

Развіваць супрацоўніцтва, падпісаўшы адпаведныя дагаворы, дамовіліся Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн Беларусі і Інстытут па вывучэнні тавараабароту нацыянальных прадуктаў Туркменістана, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, а таксама Інстытут гісторыі Акадэміі навук Туркменістана. Акрамя таго, пагадненні і дагаворы аб супрацоўніцтве падпісалі некалькі ВНУ.

На думку прэзідэнтаў, гэтыя дакументы значна ўмацуюць прававую базу двухбаковых адносін Беларусі і Туркменістана, якая з'яўляецца надзейнай асновай для далейшага ўсебаковага развіцця ўзаемадзеяння дзвюх дзяржаў, эфектыўнага выкарыстання іх патэнцыялу на карысць народаў абедзвюх краін.

Сімвалам новага якаснага этапу ўзаемадзеяння Туркменістана і Беларусі стала закладка памятнай капсулы нашчадкам у фундамент комплексу будынкаў Пасольства Туркменістана ў Мінску, у якой прынялі ўдзел лідары дзвюх дзяржаў. «Мы даём старт будаўніцтву комплексу будынкаў Пасольства Туркменістана ў Беларусі, пацвярджаючы ўпэўненасць у доўгатэрміновым характары нашага супрацоўніцтва, накіраванасць на яго развіццё і паглыбленне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Стварэнне ў Мінску астраўка туркменскай зямлі адкрые новыя магчымасці для далейшага нарошчвання яго маштабаў. Паколькі будынак Пасольства Туркменістана стане домам дружбы і месцам канструктыўных сустрэч, — адзначыў беларускі лідар. — Упэўнены, што ў хуткім часе мы будзем прысутнічаць ужо на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця новага аб'екта, які ўзбагаціць архітэктурнае аблічча нашай сталіцы».

Учора Прэзідэнт Туркменістана ўсклаў кветкі да манумента на плошчы Перамогі, а таксама наведаў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Падчас наведвання музея Гурбангулы Бердымухамедаў прызнаўся, што менавіта тут ён адчуў «сапраўдны дух Перамогі».

**Паводле БЕЛТА.**

# ДАГАВОР АБ ЕАЭС РАТЫФІКАВАНЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

«Аднак з 1 студзеня 2015 года мы выходзім на зусім новы этап інтэграцыі, і беларускі бок ставіў пытанне аб поўным зняцці гэтых выключэнняў. У выніку бакі прыйшлі да дамоўленасці, што з гэтых 3,3 млрд долараў пошлін 1,5 млрд будуць паступаць у беларускі бюджэт. Адпаведнае пагадненне дзейнічае да 2024 года ўключна», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Але ў сярэдзіне верасня расійскі бок вырашыў правесці падатковы манеўр, які разлічаны на тры гады. Яго сутнасць: павышаецца падатак на здабычу карысных выкапняў (значыць, павышаецца кошт нафты), а ў яксці кампенсацыі змяншаюцца вывазныя пошліны пры экспарце нафты і нафтапрадуктаў. У выніку — умовы гандлю нафтапрадуктамі для Беларусі пагаршаюцца. У грашовым выражэнні гэтыя страты складаюць каля 1 млрд долараў. «Пасля перагавораў расійскія партнёры пайшлі нам насустрач. У выніку прынята рашэнне на 2015 год усе вывазныя пошліны пералічваць у беларускі бюджэт. Гэтага будзе дастаткова для кампенсацыі манеўру. Пералічэнні складуць каля 2,5 млрд долараў. Што тычыцца наступных гадоў, то бакі дамовіліся аб правядзенні ў бліжэйшыя месяцы дадатковых перагавораў».

Андрэй Кабякоў выказаў упэўненасць, што Беларусь і Расія і надалей будуць знаходзіць рашэнні, якія задавоrange абодва бакі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Анатоль РУБІНАЎ:

# «ГЭТЫ ДАКУМЕНТ ПАДПІСВАЎСЯ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ»

**За Палатай прадстаўнікоў дагавор аб стварэнні ЕАЭС ратыфікаваў і Савет Рэспублікі. Сенатары адштурхоўваліся ад таго, што падпісанне дагавора дазволіць Беларусі, Расіі і Казахстану перайсці на прынцыпова новы ўзровень інтэграцыі, больш істотны і рознабаковы, чым у дзейным Мытным саюзе.**

Як і ў ніжняй палаце парламента, дакладчыкам па законапраекце выступіў **Сяргей РУМАС**. Судакладчыкам — **Уладзімір СЯНЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.**

Сенатары задавалі пытанні дакладчыкам, цікавячыся тым, як адаб'ецца работа ЕАЭС на функцыянаванні розных сфер эканомікі нашай краіны. Напрыклад, аграрна-прамысловы комплекс будзе па-ранейшаму атрымліваць падтрымку з боку дзяржавы, а беларускія прадпрыемствы, якія вырабляюць лекавыя сродкі, змогуць паспяхова канкураваць з адпаведнымі кампаніямі з Расіі і Казахстана.

— Ратыфікацыя мае беспрэцэдэнтную значнасць, бо напрамую закранае працу ўсіх галін эканомікі рэспублікі,— заявіў Уладзімір Сянько. — Нездарма ў працы па падрыхтоўцы дагавора ўдзельнічала вялікая група экспертаў — каля 140 чалавек, якія прадстаўлялі амаль усе міністэрствы і ведамствы. Дагавор адкрывае для эканомікі краіны шырокія магчымасці развіцця і мадэрнізацыі. У той жа час мы ўсведамляем, што ўступленне ў ЕАЭС не прывядзе да аўтаматычнага росквіту дзяржавы. Гэта карпатлівая праца, мэта якой — максімальнае забеспячэнне інтарэсаў Беларусі. На прыкладзе такіх рэгіянальных аб'яднанняў, як МЕРКАСУР, АСЕАН, Еўрапейскі саюз, мы добра бачым, наколькі няпростым працэсам з'яўляецца эканамічная інтэграцыя дзяржаў.

Законапраект аб ратыфікацыі дагавора сенатары прынялі аднагалосна.

**Анатоль РУБІНАЎ, старшыня Савета Рэспублікі,** адказаў на пытанні прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, прысвечаныя ратыфікацыі дагавора аб ЕАЭС.

— Ратыфікацыя дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе ў парламенце — надзвычай важнае, лёсавызначальнае рашэнне для Беларусі, — упэўнены Анатоль Рубінаў. — Гэты дакумент фактычна адкрывае новую старонку ў жыцці краіны.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» пра тое, як паўплывае ратыфікацыя Дагавора аб стварэнні ЕАЭС на жыццё простых грамадзян, Анатоль Рубінаў падкрэсліў, што гэты дакумент падпісваўся з мэтай палепшыць дабрабыт народа.

— У часы перабудовы быў такі фальшывы лозунг: калі кожны будзе багатым, то і краіна будзе багатай, — нагадаў кіраўнік верхняй палаты парламента. — Але гэта абсалютна няправільна. Дабрабыт чалавека залежыць ад патэнцыялу краіны. А апошні вызначаецца тым, наколькі развіта ў нас вытворчасць тавараў і паслуг, наколькі яны якасныя і як мы можам іх прадаць. Сёння ў свеце праблема вытворчасці больш не стаіць на першым месцы, галоўнае — барацьба за рынкі. Прадаць, выйсці на плацежаздольны рынак — гэта найважнейшая задача. Беларусь, як невялікую краіну, ніяк не можа задаволіць унутраны рынак. З гэтай прычыны экспартная арыентацыя для нас — невыпадковая, без яе мы не можам жыць. Таму новыя магчымасці, якія адкрывае падпісанне дагавора аб стварэнні ЕАЭС, дапамогуць краіне больш зарабіць, павысіць агульны эканамічны патэнцыял па краіне і, як вынік, павялічыць зарплаты для грамадзян.

Анатоль Рубінаў дадаў, што адкрыты рынак тавараў і паслуг пашырае магчымасці выбару для людзей.

— Таму гэты дагавор не для прадпрыемстваў і нейкіх суб'ектаў гаспадарання, а менавіта для людзей, — заявіў старшыня Савета Рэспублікі. — Стан эканомікі дзяржавы непасрэдна ўплывае на дабрабыт яе народа.

* * *

Таксама на ўчарашнім пасяджэнні Савета Рэспублікі сенатары ратыфікавалі пратакол аб унясенні змен у пагадненне аб узаемным забеспячэнні захаванасці сакрэтнай інфармацыі ў рамках АДКБ ад 18 чэрвеня 2014 года, а таксама пагадненне аб абароне сакрэтнай інфармацыі ў рамках СНД. Былі прыняты законапраекты «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абароны інфармацыі», «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь» і «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб зброі».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# ЭКАНАМІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ ЗАХАВАЕЦЦА

**На ўчарашнім пасяджэнні дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ратыфікавалі Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Гэтаму папярэднічала грунтоўная праца над адпаведным законапраектам, абмеркаванне яго і вывучэнне перспектыў для нашай краіны ад удзелу ў гэтым міжнародным аб'яднанні. Дакладчыкам па законапраекце быў Сяргей РУМАС, член Прэзідыума Савета Міністраў і член Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі ад Рэспублікі Беларусь.**

### АД ВЫКЛЮЧЭННЯЎ І АБМЕЖАВАННЯЎ ЁСЦЬ ШАНЦ ПАЗБАВІЦЦА РАНЕЙ ЗА 2025 ГОД

Па словах выступоўцы, эканоміка нашай краіны будзе адчуваць паступовы эфект ад стварэння ЕАЭС ва ўсіх сферах.

— Па сутнасці, не засталося ні адной галіны, інтарэсы якой не закранаў бы гэты дагавор, — заўважыў Сяргей Румас. — Па кожным кірунку ёсць «дарожная карта».

Планавалася, што на гарманізацыю заканадаўства адводзіцца 10 гадоў. Але, па інфармацыі дакладчыка, гэтая лічба азначае канечны тэрмін ліквідацыі выключэнняў і абмежаванняў. Сяргей Румас выказаў упэўненасць, што бакі адрэгулююць адпаведныя пытанні раней за 2025 год.

Прадстаўнікоў улады і звычайных грамадзян вельмі турбавалі наступствы для нашай дзяржавы ад падатковага манеўру ў Расіі. Але на днях гэтая праблема вырашылася. Прадстаўнікі Беларусі дабіліся з расійскім бокам дамоўленасцяў, якія цалкам нівеліруюць уплыў падатковага манеўру на нашу эканоміку.

— Бакі падпісалі практ змянення ў пратакол аб размеркаванні вывазных мытных пошлін, які прадугледжвае поўнае захаванне ў бюджэце Рэспублікі Беларусь усіх належных вывазных мытных пошлін на нафтапрадукты, — падкрэсліў падчас размовы з журналістамі Сяргей Румас. — Усе варыянты разлікаў паказваюць, што Рэспубліка Беларусь атрымае ў 2015 годзе, акрамя тых 1,5 млрд, аб якіх была дамоўленасць пры падпісанні дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, яшчэ не менш за мільярд долараў — гэта страты, якія маглі б узнікнуць пры правядзенні ў Расіі вялікага падатковага манеўру. Пратакол падпісваецца на адзін год, і мы разлічваем у наступным годзе вярнуцца да гэтага пытання.

### ШОСТАЯ ЭКАНОМІКА Ў СВЕЦЕ

На пытанне, ці не страціць дзяржава эканамічнага суверэнітэту з уступленнем у гэту арганізацыю, дакладчык адказаў адмоўна.

— Такой рызыкі няма, — заявіў ён. — Мы павінны выкарыстоўваць тыя перавагі інтэграцыі, якія дае нам уступленне ў ЕАЭС. Нягледзячы на тое, што мы перадалі шэраг функцый на наднацыянальны ўзровень у калегію або ў савет Еўразійскай эканамічнай камісіі, у Рэспублікі Беларусь заўсёды ёсць механізм, які дазволіць адмяніць тое ці іншае рашэнне, якое будзе нявыгадна для нас. Хачу сказаць, што мы працуем у Еўразійскай эканамічнай камісіі ўжо больш за два гады, і Беларусь ні разу не скарысталася гэтым правам.

**Мікалай САМАСЕЙКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах** (якая і рыхтавала законапраект «Аб ратыфікацыі дагавора аб ЕАЭС»), выступаючы перад дэпутатамі, звярнуў увагу на тое, што Еўразійскі эканамічны саюз стане шостай эканомікай у свеце.

— Мы ўпэўнены, што ўступленне ў сілу дагавора аб ЕАЭС дасць новыя магчымасці для доўгатэрміновага росту эканомікі нашай краіны. Разам з тым, ва ўсіх нашых партнёраў павінна быць разуменне таго, што мы будуем эканамічны саюз, які не прадугледжвае бар'ераў, абмежаванняў, выключэнняў у сферы гандлю і аказання паслуг.

### ЕАЭС ПАВІНЕН ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЦЁ КОЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

**Віталь БУСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах,** каментуючы прыняцце законапраекта, падкрэсліў неабходнасць стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза.

— Мне пашчасціла быць удзельнікам станаўлення Мытнага саюза, Адзінай эканамічнай прасторы, і вось, нарэшце, сёння мы гаворым пра ратыфікацыю дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза. Відаць, ужо няма ніякіх сумненняў у тым, ці патрэбны гэты саюз. Ён проста неабходны ва ўмовах глабальнага свету. А такой гордай маленькай краіне, як Беларусь, вельмі складана выжыць адной. Калі мы сёння аб'ядноўваемся дзвюма краінамі, то атрымліваем саюз, у якім 170 мільёнаў чалавек насельніцтва, і маем вельмі магутны патэнцыял. Калі ЕАЭС пакажа сваю жыццяздольнасць і эфектыўнасць, то зможа зацікавіць і іншыя краіны. Вельмі шчыльна да гэтага падышла Арменія, ідуць перамовы з Кіргізіяй. Думаю, гэта не апошнія краіны, якія ўвойдуць у склад ЕАЭС. Але, паўтараю, для гэтага трэба паказаць яго эфектыўнасць. Апошняя ж будзе відавочнай, калі кожны з нас адчуе, што сапраўды саюз адбыўся, пачаў працаваць, палепшыў жыццё канкрэтнага чалавека.

* * *

На ўчарашнім пасяджэнні, акрамя ратыфікацыі дагавора аб ЕАЭС, дэпутаты разгледзелі яшчэ тры законапраекты. Гэта праект Закона «Аб ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі, прасочвальнасці сельскагаспадарчых жывёл, ідэнтыфікацыі і прасочвальнасці прадуктаў жывёльнага паходжання», змены і дапаўненні ў Закон «Аб гарантаванні кампенсаванні банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб» і ў Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь. Таксама было прынята пастанаўленне Палаты прадстаўнікоў аб правядзенні парламенцкіх слуханняў на тэму «Дзяржаўна-прыватнае партнёрства: міжнародны вопыт і перспектывы для Рэспублікі Беларусь».

**Надзея ЮШКЕВІЧ** ■

# ДАРАГІЯ РАБОЧЫЯ РУКІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Практыка сведчыць, што арганізацыі, якія зрабілі заказ на кадры, далёка не заўсёды забяспечваюць працаўладкаванне заказаных выпускнікоў і заказчыкі не нясуць адказнасці за заяўленую патрэбу. Пакуль сур'ёзных праблем з працаўладкаваннем выпускнікоў не ўзнікала. Так, у 2013 годзе атрымалі накіраванне на работу 97,8% выпускнікоў з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй і 96,2% з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Больш складана ідуць справы з замацаваннем маладых спецыялістаў на рабочых месцах...

На думку Віктара Богуша, гэта комплексная праблема. З аднаго боку, даводзіцца канстатаваць нізкі ўзровень арыентацыі выпускнікоў на будучую прафесійную дзейнасць. З іншага боку, замацаванню моладзі не спрыяе нізкая канкурэнтаздольнасць саміх рабочых месцаў, узровень заработнай платы і адсутнасць сацыяльнага пакета.

— Трэба максімальна задзейнічаць магчымасці наймальнікаў у прадастаўленні стымулюючых выплат, для вырашэння жыллёвых праблем і стварэння ўмоў для завочнага навучання маладых спецыялістаў ва ўстановах больш высокага ўзроўню адукацыі, — падкрэсліў Вадзім Богуш.

Летась мэтавы прыём на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі склаў усяго 6%, а на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 15%. У Міністэрстве адукацыі лічаць, што больш актыўнае выкарыстанне мэтавай падрыхтоўкі дазволіць павысіць адказнасць наймальніка за сфарміраваны заказ і забяспечыць умовы для рэалізацыі дадатковых прэферэнцый для навучэнцаў, а затым і маладых спецыялістаў. Гэта можа быць выплата дадатковых стыпендый паспяховым навучэнцам, выплата разавых субсідый і матэрыяльнай дапамогі, прадастаўленне арэнднага жылля і г.д. Мэтавы набор трэба давесці ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі да 50%, а ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі — да 30%.

За апошнія тры гады намецілася тэндэнцыя змяншэння напаўняльнасці прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў, што цягне за сабой павелічэнне кошту падрыхтоўкі навучэнцаў. Так, выдаткі на аднаго навучэнца ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, складаюць 26,6 млн рублёў у год, а выдаткі на падрыхтоўку аднаго навучэнца прафесійна-тэхнічнай установы складаюць 28,9 млн рублёў у год. Найменшыя выдаткі ў мінскіх навучальных установах, якія маюць большую напаўняльнасць.

**Выдаткі на падрыхтоўку аднаго навучэнца прафесійна-тэхнічнай установы складаюць 28,9 млн рублёў у год.**

Зараз працягваецца работа па скарачэнні тэрмінаў атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі з 1 года 6 месяцаў да аднаго года і з двух гадоў да 1 года 6 месяцаў. Па словах першага намесніка міністра адукацыі, змяншэнне тэрмінаў падрыхтоўкі рабочага ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі на паўгода скарачае бюджэтныя выдаткі на 14,5 млн рублёў на аднаго навучэнца ў год.

— Кошт падрыхтоўкі кадраў у сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі ва ўсіх краінах дастаткова высокі, таму ў многіх дзяржавах ствараюць умовы (прэферэнцыі) для прыцягнення да фінансавання адукацыйнага працэсу наймальнікаў усіх формаў уласнасці. Прымяняецца так званая дуальная сістэма. Дзяржава аплачвае развіццё ўстаноў адукацыі, падрыхтоўку па агульнаадукацыйных, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплінах, а наймальнік бярэ на сябе вытворчае навучанне і практыку навучэнцаў. Мяркую, што надышоў час і нам абмеркаваць магчымасць укаранення такога механізму, — дадаў Вадзім Богуш.

Удзел у выязной калегіі Міністэрства адукацыі ўзяў прэм'ер-міністр Міхаіл МЯСНІКОВІЧ. Кіраўнік урада выказаў незадаволенасць тым фактам, што ў галоўным адукацыйным ведамстве краіны не выканалі яго даручэнне па стварэнні сістэмы неперарыўнай падрыхтоўкі кадраў. Па меркаванні Міхаіла Мясніковіча, гэта павінен быць своеасаблівы вучэбны кластар ці холдынг, які аб'ядноўвае рашэнне трох задач: падрыхтоўку рабочых кадраў, спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і кадраў з вышэйшай адукацыяй. У якасці прыкладу прэм'ер-міністр прывёў Вышэйшы дзяржаўны каледж сувязі.

Кіраўнік урада парэкамендаваў працаваць больш канкрэтна. «Міністэрства адукацыі не павінна выдаваць рэкамендацыі на ўсе выпадкі жыцця. Яму трэба браць больш адказнасці на сябе і прымаць кіраўніцкія рашэнні, можа быць, дзесьці нават навязваць свае патрабаванні», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ ЧАСавыя паясы

## ГАДЗІНА ТУДЫ — ГАДЗІНА СЮДЫ,

### альбо Мы застаёмся ў «леце»

**Беларусь не будзе пераходзіць на зімовы час з 26 кастрычніка ўслед за Расіяй. Такое рашэнне было прынята ва ўрадзе пасля разгляду аргументаў спецыяльнай камісіі наконт «за» і «супраць» пераводу стрэлак.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Дзяржстандарта, з вышэйназванай даты вылічэнне часу ў Беларусі і сумежных краінах будзе наступным. У Мінску і Маскве (на расійскай тэрыторыі ўстанаўліваецца 11 часавых зон, маскоўскі час будзе служыць зыходным пры вылічэнні мясцовага часу ў гэтых зонах) ён будзе аднолькавым. Розніца з Украінай, Латвіяй, Літвой складзе адну гадзіну назад, а з Польшчай — дзве гадзіны. Гэтыя краіны практыкуюць пераход на зімовы — летні час.

З сакавіка 2015 года Украіна, Літва, Латвія і Польшча пераходзяць на летні час. У гэтым выпадку ў пяці краінах — (Беларусь, Расія, Латвія, Літва і Украіна) будзе аднолькавы час — у параўнанні, як і ў вышэйпрыведзеным выпадку, з маскоўскім часам. У Польшчы з сакавіка розніца складзе адну гадзіну назад.

Нагадаем, што наша краіна адмовілася ад пераходу на сезонны час у 2011 годзе. Рашэнне прымалася з мэтай забеспячэння на тэрыторыі Беларусі ўзгодненага з дзяржавамі — удзельніцамі Мытнага саюза вылічэння часу, а таксама поўнага выкарыстання светлага часу сутак, паляпшэння ўмоў працы і адпачынку насельніцтва. З таго ж года адмяніла сезонны пераход стрэлак і Расія. Аднак 1 ліпеня гэтага года Дзярждума Расійскай Федэрацыі прыняла рашэнне вярнуць у краіну зімовы час, што і адбудзецца ў суседняй краіне з 26 кастрычніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Надвор'е

## АПОШНІ ПОДЫХ ЛЕТА?

**Гэтымі днямі на тэрыторыю Беларусі будуць паступаць цёплыя паветраныя масы з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

### Сіноптыкі абяцаюць больш за 20 цяпла мінімум да сярэдзіны кастрычніка

Таму ў пятніцу будзе без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 17-22 цяпла. Чакаецца сапраўды камфортнае надвор'е і ў выхадныя. Аднак у суботу ў паўночных раёнах, а ў нядзелю месцамі па краіне прагназуюць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў ноч на выхадныя складзе плюс 6-13 градусаў, а ўдзень — ад 13 цяпла па поўначы, да плюс 22 градусаў па поўдні краіны.

У панядзелак тэрыторыя краіны застанецца ў зоне павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўночным ускодзе магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпературны фон у пачатку наступнага тыдня істотна не зменіцца. У ноч на панядзелак чакаецца 6-13 цяпла, удзень будзе плюс 12-19 градусаў, а па Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 21 цяпла. Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, цёплае і камфортнае надвор'е без істотных ападкаў захаваецца ў нас амаль да сярэдзіны кастрычніка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ВЕТЭРАНЫ АТРЫМАЮЦЬ МАТЭРЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ

**З 1 красавіка па 1 мая 2015 года беларускім ветэранам будзе праведзена выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Матэрыяльную дапамогу атрымаюць інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, асобныя катэгорыі грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, а таксама Героі Сацыялістычнай Працы, удастоеныя гэтага звання за заслугі ў гады вайны.

Плануецца, што сума выплат будзе трохі вышэйшай, чым тая, якую выплацілі ветэранам да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нагадаем, што да 70-годдзя вызвалення Беларусі матэрыяльную дапамогу атрымалі 50,1 тыс. ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Сума выплат склала 236 млрд рублёў.

**Святлана БУСЬКО.**

## УСХОДНІЯ ДЫВАНЫ Ў МІНСКУ

**Учора адкрылася першая выстава беларуска-туркменскіх тавараў, якая будзе працаваць як кірмаш: значыць, абсалютна любы экспанат можа быць прададзены.**

Сваю прадукцыю на «Чыжоўка-Арэне» прадстаўляюць каля 50 гандлёвых марак абедзвюх краін. Туркменскія прадпрымальнікі прывезлі ў Мінск знакамітыя дываны, тэкстыль, бавоўну і нацыянальную вопратку. Зацікаваць спажыўцоў стэнды з таматамі, брынзай, лепшымі гатункамі гарбаты, сокаў і мінеральнай вады. Беларусь прадстаўць найлепшую прадукцыю мясакамбінатаў, шакаладных фабрык, швейных і фармакалагічных прадпрыемстваў.

Як сцвярджаюць арганізатары, уваход на выставу вольны. Акрамя таго, на прылеглай тэрыторыі будзе арганізаваны кірмаш Магілёўскай вобласці, дзе можна будзе купіць агародніну і садавіну па вельмі добрых цэнах.

**Ул. інф.**

## «ФІЯТ» УРЭЗАЎСЯ Ў ЦЯГАЧ...

**У Смалявіцкім раёне адбылося жудаснае дарожна-транспартнае здарэнне, у выніку якога загінулі чатыры чалавекі.**

Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, трагедыя адбылася на 37-м кіламетры аўтадарогі Р-59 Лагойск — Смалявічы — Мар'іна Горка паблізу вёскі Заказінец. Бліжэй да апоўдня вадзіцель легкавога аўтамабіля «Фіят», рухаючыся, як было ўстаноўлена, з перавышэннем хуткасці, не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго аўто сутыкнулася з сядзельным цягачом, што стаяў на ўзбочыне дарогі. Работнікі МНС былі вымушаны пры дапамозе гідраўлічнага інструменту даставаць з легкавіка целы загінулых трох жанчын і мужчыны. Расследаванне прычын і абставін ДТЗ праводзіць ДАІ Смалявіцкага раёна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой»**
**извещает своих акционеров о проведении внеочередного общего собрания акционеров 21 октября 2014 года.**
**Собрание состоится по адресу:**
**Минский район, п. Ратомка, ул. Заславская, 8а, актовый зал.**
**Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 по месту проведения собрания. Начало работы собрания в 11.00**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**
1. О направлениях распределения чистой прибыли на второе полугодие 2014 года.
2. О внесении изменения в Устав ОАО «Минсктелекомстрой».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14 по 20 октября 2014 г., по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1 (кабинет главного бухгалтера) с 13.00 до 16.00, либо в день проведения собрания 21 октября 2014 г. – по месту его проведения.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров – 10 октября 2014 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, оформленную в установленном порядке.

УНП 100068131

ИЗВЕЩЕНИЕ
**Государственное производственное объединение**
**«Минскстрой»**
**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**
**объекта «Многоэтажный жилой дом не повышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная горка-3» (жилой дом),**
***опубликованную в газете «Звязда» от 28 мая 2013 года № 95 (27460):***

УНП 100071325

В соответствии с Решением Мингорисполкома № 2708 от 22.09.2011 с учетом внесения изменений от 13.03.2014 № 625 на строительство квартиры № 90 договор создания объекта долевого строительства будет заключаться с сотрудниками ГПО «Минскстрой» и организаций, входящих в состав объединения, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

ИЗВЕЩЕНИЕ
**Государственное производственное объединение**
**«Минскстрой»**
**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**
**объекта «Многоэтажный жилой дом не повышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная горка-3» (жилой дом),**
***опубликованную в газете «Звязда» от 10 мая 2013 года № 85 (27450):***

УНП 100071325

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений №№ 43, 46, 59, 100, 184 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: 3-комнатные квартиры – 1300 долларов США, 2-комнатные квартиры – 1450 долларов США, 1-комнатные квартиры – 1500 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату зачисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

■ Погляд

# ЖЫЛЛЁ МАЁ І НАША

## ЯК АДРАМАНТАВАЦЬ ПАД'ЕЗД У ШМАТПАВЯРХОВІКУ?

**Ва ўласным доме людзі самі сабе гаспадары. І там, быццам на далоні, відаць, які чалавек выхаваны, якія ў яго здольнасці і магчымасці. Іншая справа — шматпавярховік, дзе людзі, пражыўшы побач многія гады, у большасці выпадкаў застаюцца зусім чужымі. І дзе, акрамя кватэр, усё агульнае — лесвічныя пляцоўкі, ліфты, смеццеправоды, падвалы. Тут ужо гаспадарскую «струнку» кожнага з жыльцоў заўважыць цяжка. Бо ўсё быццам і сваё, штодзённа і на працягу многіх гадоў. Але за межамі кватэры ўжо не маё — наша.**



Вось, напрыклад, мой/наш пад'езд гродзенскага шматпавярхоўка. Сцяна першага паверха сустракае жыльцоў і іх гасцей ужо даўнімі «аўтографамі» з серыі «тут быў ...» ці «пра кагосьці», прычым, не толькі з выкарыстаннем нарматыўнай лексікі. А на маім/нашым паверсе «самавыяўляліся» з фарбай «аматары» футболу. Нават дату пакінулі — 2001 год. З таго часу і засталося.

**На словах, вядома, усе — за навядзенне парадку. Аднак толькі да таго моманту, пакуль не заходзіць размова пра грошы.**

Можна сабе ўявіць, што хтосьці будзе вось такім чынам размалёўваць сцены ўласнага дома? Зрэшты, калі гэта ўчыняў хтосьці з дзяцей у нашым пад'ездзе (а так, верагодна, і было), то яны ўжо павырасталі. І цяпер на парадку дня, здавалася б, элементарнае і не надта складанае, у параўнанні з іншымі работамі па рамонце жылля, пытанне. Трэба асвяжыць пабелку і пафарбаваць сцены і агульныя дзверы на лесвічных пляцоўках, каб не выглядала так убога.

Гэта мне так здаецца. Ды і, наколькі ведаю, многім іншым суседзям па пад'ездзе. Але, пэўна, не ўсім. Ёсць катэгорыя людзей, якіх можа занепакоіць хіба што пагроза перасялення ў меншую жылплошчу з-за камунальных неплацяжоў. А яшчэ больш тых, хто і пальцам не паварушыць, каб нешта зрабіць у агульных інтарэсах. У гэтым можна пераканацца, калі рыхтуюцца калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы па тых ці іншых жыллёва-камунальных пытаннях. Адзін чалавек, не атрымліваючы нейкіх асабістых «дывідэндаў», стараецца зрабіць нешта карыснае для, гаворачы афіцыйнай моваю, сумеснага домаўладання. А для другога прайсціся па кватэрах і сабраць подпісы жыльцоў — праблема. Лепш спіхнуць гэтую грамадскую нагрузку на іншага.

А на словах, вядома, усе — за навядзенне парадку. Аднак толькі да таго моманту, пакуль не заходзіць размова пра грошы. Вельмі распаўсюджанай з'яўляецца думка, што я, маўляў, ужо шмат гадоў раблю адлічэнні на капітальны рамонт, а значыць, з гэтых сродкаў і павінны фінансавацца ўсе работы.

Сапраўды, у штомесячных «жыроўках» ёсць артыкул «адлічэнні на капрамонт». Сума прапарцыянальная плошчы жылога памяшкання: напрыклад, з трохпакаёвай кватэры ў нашым доме апошні плацеж склаў 39 тысяч 840 рублёў. Гэтыя сродкі паступаюць на разліковы рахунак раённага УЖРЭП і расходуюцца на рамонт дамоў, якія больш за ўсё маюць у ім патрэбу. «Адраснага» накаплення (асобна па кожным жылым доме) не адбываецца.

Але пры гэтым зусім не факт, што абавязковых штомесячных адлічэнняў на капрамонт (яны ўведзены ў Беларусі з 1999 года) хапіла б, напрыклад, на цеплавую рэабілітацыю фасадаў, якую два гады таму зрабілі ў нашым доме.

А цяпер — пра сённяшнія рэаліі. Згодна з пастановай Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ад 4 чэрвеня 2014 г. № 12, вызначаны пералік відаў работ па бягучым рамонце жыллёвага фонду і крыніцах іх фінансавання. Цяпер рамонт месцаў агульнага карыстання ў пад'ездзе шматпавярхоўка павінен, пры жаданні жыльцоў, ажыццяўляцца за іх сродкі. Адпаведнае рашэнне прымаецца сходам жыльцоў. Па іх заяўцы прадстаўнік ЖЭСа зробіць абмер, вызначыць аб'ёмы работ, пасля чаго сумесна з УЖРЭП будзе складзены каштарыс. А затым будуць заключаны дагаворы паміж выканаўцам рамонту і пакватэрна з усімі жыльцамі — з указаннем відаў работ, іх кошту і тэрмінаў правядзення. Работы выконваюць комплексныя брыгады пры ЖЭСах, укамплектаваныя спецыялістамі рознага профілю. Спатрэбіцца — будуць прыцягнуты работнікі электрасетак, «Гаранта», «Белтэлекама» і іншых арганізацый. Жыльцы могуць самі купляць матэрыялы для рамонту, звяртацца для правядзення работ у любую будаўнічую арганізацыю.

Якія перспектывы гэтай навацыі? Дагэтуль, на працягу дзесяці гадоў, як вядома, існавала практыка долевага ўдзелу жыльцоў у рамонце месцаў сумеснага домаўладання. Паступова людзі маглі прызвычаіцца, што аб парадку ў сваіх пад'ездах трэба клапаціцца і ўласнымі сродкамі. Але не скажаш, што такое разуменне ўжо стала нормай. Прынамсі, у нашым доме жадання пасупрацоўнічаць у гэтым кірунку з жыллёва-камунальнай службай пакуль не было. І што цяпер, калі трэба наводзіць парадак у пад'ездзе ўжо не на долевых умовах, а выключна за свой кошт?

Паводле інфармацыі з аддзела па эксплуатацыі жыллёвага фонду УЖРЭП Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў Гродна, чаргі на выкананне работ па рамонце месцаў агульнага карыстання па новых правілах няма, але прыклады па некаторых шматпавярхоўках ужо ёсць. «Цана пытання» па кожным доме, адпаведна з яго тыпам і аб'ёмам работ, розная, але зусім не «завоблачная». Напрыклад, у «хрушчоўцы» у ліпеньскіх цэнах рамонт абышоўся кожнай кватэры ў 1,1 мільёна рублёў, у «брэжнеўцы» — у 1,45 млн руб. На вуліцы Паповіча жыльцы аднаго з пад'ездаў дзевяціпавярхоўка купілі матэрыялы, а за работу заплацілі ў сярэднім каля 640 тысяч рублёў. Пры гэтым памер платы за рамонт месцаў агульнага карыстання (яна ўключаецца ў квітанцыю па разліку за жыллёва-камунальныя паслугі) вызначаецца, зыходзячы з агульнай плошчы кватэр. Для людзей, якім праблематычна разлічыцца адразу, магчыма растэрміноўка плацяжу на некалькі месяцаў.

Спадзяюся, што і ў пад'ездзе нашага дома ўсё ж здолеем навесці элементарны парадак. Калі ж не атрымаецца «калгасам», давядзецца купляць фарбу, іншыя матэрыялы і наводзіць «марафет» хаця б на сваёй лесвічнай пляцоўцы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

### ДА ВЕДАМА:

**Работы па рамонце жыллёвага фонду, якія фінансуюцца ўласнікамі, наймальнікамі жылых памяшканняў (паводле пастановы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ад 4 чэрвеня 2014 г. № 12):**

*— расшыўка швоў, заштукоўванне выбоін, трэшчын, асобных участкаў сцен пад'ездаў* **(у гэтых і наступных відах работ — за выключэннем дапаможных памяшканняў, прызначаных для размяшчэння і абслугоўвання інжынернага абсталявання і інжынерных сетак жылога дома);**

*— аднаўленне тынкоўкі і абліцоўкі, выраўноўванне сцен і столяў пад'ездаў, у тым ліку падвясных;*

*— аднаўленне і ўмацаванне ляпных дэкаратыўных дэталяў пад'ездаў;*

*— заштукоўванне выбоін, трэшчын у цэментных, бетонных падлогах пад'ездаў;*

*— работы па рамонце, замене пакрыцця падлогі пад'езда без змянення канструкцыі;*

*— работы па рамонце, замене асобных элементаў смеццеправодаў;*

*— малярныя работы (у тым ліку афарбоўка сцен, столяў, аконных і дзвярных запаўненняў, трубаправодаў, ацяпляльных прыбораў, элементаў смеццеправодаў, паштовых скрынак, кратаў, поручняў) у пад'ездах;*

*— рамонт печаў, дымаходаў.*

**Гэта незвычайнае мерапрыемства адбудзецца 11 кастрычніка на спецыялізаванай выставе-форуме тавараў і паслуг «Мацярынства і дзяцінства». Да ўдзелу арганізатары запрасілі больш за 30 пар таленавітых і актыўных дзяцей-блізнят дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, а таксама іх бацькоў і дарослых блізнят і двайнят рознага полу, узросту і прафесіі. Дарэчы, толькі сёлета ў сталіцы нарадзілася амаль 240 пар блізнят!**

# ІЗНОЎ ДВОЙНЯ

## У Мінску ўпершыню пройдзе фестываль двайнят і блізнят

У праграме фестывалю, які пройдзе ў сценах сталічнага Палаца дзяцей і моладзі, — шоу талентаў, гульні на выяўленне творчых здольнасцяў і ўзаемаразумення дзяцей, конкурс бліц-апытання, агульнае фатаграфаванне і, безумоўна, узнагароджанне памятнымі прызамі ўсіх без выключэння ўдзельнікаў у розных намінацыях. У дадатак госці фэсту змогуць паглядзець прадстаўленне для дзяцей і мультпарад, а таксама атрымаць кансультацыю вопытнага ўрача па пытаннях здароўя і развіцця блізнят.




У гэты ж дзень на выставе пройдуць майстар-класы па ёзе для маладых бацькоў, а 12 кастрычніка, у нядзелю, наведвальнікаў чакаюць майстар-клас па дзіцячых прычосках, семінар ад вопытных бацькоў па вандроўках усёй сям'ёй і забаўляльная гульнявая праграма.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

■ Фестываль

# Напеў зямлі маёй

**Трыццаць два аматарскія калектывы з усіх куткоў Міншчыны возьмуць удзел у XI абласным фестывалі народнай творчасці «Напеў зямлі маёй», што адбудзецца ў Мар'інай Горцы 11 кастрычніка. Урачыстае адкрыццё музычнага форуму ў 12.00, конкурсная праграма прадоўжыцца да 15.00, затым — выступленні ўладальнікаў гран-пры і лаўрэатаў мінулых фестываляў, а ў 17.00 — пераможцаў чакае ўзнагароджанне.**

«Напеў зямлі маёй» — галоўная культурная падзея ў жыцці цэнтральнага рэгіёна, і абласны выканаўчы камітэт надае фестывалю значную ўвагу: пераможцаў у кожным жанры чакаюць камп'ютары для студыі гуказапісу, музычныя інструменты. Гран-пры фестывалю — мікрааўтобус — урачыста ўручаць калектыву-пераможцу. Акрамя таго, для заахвочвання ўдзельнікаў свае прызы вызначыла і Мінская гарадская арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў культуры.

Фестываль «Напеў зямлі маёй» праводзіцца з 2001 года. Ён нарадзіўся і атрымаў пастаянную прапіску на багатай талентамі пухавіцкай зямлі — радзіме Міхаіла Ельскага, Іосіфа Жыновіча, Ігара Лучанка. Музычны форум ахоплівае ўсю жанравую палітру народнага мастацтва. У ім бяруць удзел лепшыя з лепшых «народных» і «ўзорныя» аматарскія калектывы з кожнага раёна Міншчыны і горада Жодзіна. Часам колькасць удзельнікаў гэтага, аднаго з самых вялікіх па маштабе, фестывалю Міншчыны перавышае 900.

Фестываль — своеасаблівы экзамен для калектываў, бо кожнаму з іх даецца магчымасць прадэманстраваць свой творчы і прафесійны патэнцыял перад прыхільнікамі, журы. Дарэчы, яго ўзначальвае мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Г.Цітовіча, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, старшыня Беларускага саюза музычных дзеячаў, прафесар Міхаіл Дрынеўскі. Наогул, у склад журы ўваходзяць сапраўдныя мэтры ў розных галінах мастацтва. Сярод іх кампазітар, дацэнт кафедры эстрады Мінскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алег Елісеенкаў, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча Аляксандр Крамко. Ганаровы госць фестывалю — кампазітар, народны артыст Савецкага Саюза, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, старшыня Беларускага саюза кампазітараў, прафесар Ігар Лучанок.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Будзь у курсе

# На МКАД цяпер — да 100

**На першым участку Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогі павялічылі хуткасць руху.**

Першы этап праекта па павелічэнні хуткасці на МКАД рэалізаваны на трэцяй паласе руху, дзе ціснуць на педаль газу ўжо можна да 100 кіламетраў у гадзіну. Гаворка ідзе пра ўчастак ад вуліцы Байкальскай да вуліцы Скарыны ў абодвух напрамках. У бліжэйшы час аналагічна будзе павялічана дазвольная хуткасць да 100 кіламетраў у гадзіну па трэцяй паласе руху МКАД на ўчастку ад Лагойскага тракта да праспекта Пераможцаў. Зробленa гэта будзе за выключэннем участка знешняга кальца ад 42 да 44 кіламетра МКАД у сувязі з яго канструктыўнымі асаблівасцямі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

И З В Е Щ Е Н И Е

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**

**объекта «Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)».**

**Жилой дом № 36 по генплану в г. Минске,**

***опубликованную в газете «Звязда» 31 декабря 2013 года:***

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 2-комнатной квартиры № 83 с учетом выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: 1400 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США и составит 1350 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Вікторыя СЯНКЕВІЧ:

# «САДЗІШСЯ Ў ЛОДКУ І ПЛЫВЕШ З КАМАНДАЙ»

**Вядучая тэлеканала «Беларусь 1» лічыць, што сапраўдны журналіст можа працаваць у любым месцы планеты**

**Яна аднойчы выбрала прафесію эканаміста, а потым адмовілася ад яе, каб працаваць на тэлебачанні. Прайшло больш за дзесяць гадоў, і яна не толькі заваявала давер і любоў гледачоў як вядучая і стваральніца аўтарскіх праектаў, але і паспрабавала сябе ў ролі адміністратара. Давайце даведаемся ў вядомай вядучай «Панарамы» і намесніка дырэктара Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі Вікторыі Сянкевіч, ці можна любоў гледача вымераць лічбамі, што самае важнае для вядучага і дзе лепш спасцігаць прафесійнае майстэрства.**



**— Вікторыя, сёлетняя перамога на «Тэлевяршыні» ў намінацыі «Лепшы вядучы штодзённай інфармацыйнай праграмы» дасталася вам. Як удаецца быць лепшай?**

— У медыяпрасторы Беларусі шмат годных журналістаў і вядучых. Я заўсёды вучуся ў сваіх жа калег, за што ім вельмі ўдзячная. У нас сёння працуе сур'ёзная каманда, таму, думаю, калі ёсць магчымасць працаваць з такімі людзьмі, вынік заўважаюць і некага з нас выдзяляюць.

**— Памятаеце, як адрэагавалі, пачуўшы са сцэны сваё імя?**

— Я ведала, хто са мной у адной намінацыі, і там кожная з дзяўчат была вартая перамогі. Мы з калегамі з розных тэлеканалаў нават смяяліся: маўляў, у тым годзе такія людзі прадстаўлены, што і прайграць не сорамна нікому. Безумоўна, была радасць, калі агучылі імёны пераможцаў, мяне падтрымлівалі калегі ў зале. І было прыемна, гледзячы свайму кіраўніцтву ў вочы, са сцэны сказаць «дзякуй» за магчымасць аказацца там.

**— Давайце пагаворым пра тэлевізійную кухню. Як праграме кшталту «Панарамы» сёння быць запатрабаванай і прызнанай?**

— «Панарама», на маю думку, з'яўляецца класікай інфармацыйнага жанру на беларускім тэлебачанні. Але мы кожны год імкнёмся ўносіць у праграму новыя штрыхі. Напрыклад, у нас з'явіліся і, хочацца спадзявацца, палюбіліся гледачам рубрыка «У курсе», дзе асвятляюцца навіны эканомікі, праект «Неитоги», дзе збіраем самае цікавае, што засталося за кадрам падчас здымак за тыдзень. І галоўнае — сур'ёзныя навіны эканомікі, культуры, палітыкі з жыцця нашай краіны і замежжа. Веру, у нас ёсць свая аўдыторыя, якая застанецца на «першай» кнопцы з той прычыны, што тут ёй прапаноўваюць дакладную інфармацыю. На тэлеканале «Беларусь 1» ёсць месца і для эксперыменту. З камандай Агенцтва тэлевізійных навін (АТН) мы гэта ілюструем на пляцоўцы праграмы «Галоўны эфір», дзе кожны раз адбываецца шмат усяго цікавага. І, як паказвае доля гэтай праграмы і доля тэлеканала наогул, мы крочым у правільным напрамку.

**— Скажыце, любоў гледача вымяраецца рэйтынгам?**

— Лічбамі мы вымяраем не толькі любоў аўдыторыі, але і сваю ўласную працу. Усе мы працуем на долю канкрэтнай праграмы, прадукту Агенцтва тэленавін і тэлеканала «Беларусь 1». Часам гледачы і лісты нам дасылаюць. Расказваюць, дзе мы малайцы, альбо падказваюць, у чым трэба выправіцца. Я памятаю, неяк атрымала ліст ад гледача з Амерыкі, які глядзіць нас па «Беларусь 24» і ў інтэрнэце. І ў нас склаўся вельмі цёплы дыялог...

**— Вы ў свой час вучыліся і стажыраваліся ў Германіі. З пазіцыі таго вопыту як выглядае іх і наш падыход у працы над стварэннем інфармацыйнага прадукту?**

— У немцаў крыху адрозніваецца падача інфармацыі. Там ідуць ад карцінкі і чыста тэхнічна ў Германіі па-іншаму працуюць: у іх больш працяглыя планы і адрозніваецца відэарад, работа над мантажом матэрыялу. А калі казаць пра выстройванне схемы працы агенцтва навін (я працавала на ZDF — адным з найбуйнейшых тэлеканалаў у Германіі), то тут у нас падобныя метады: ранішнія лятучкі, абмеркаванне ўчарашняга выпуску навін, планаванне вячэрняга эфіру, пастаноўка пэўных творчых задач. У іх можна павучыцца дакладнасці ў пастаноўцы і выкананні задач, у той час як наш моцны бок — гэта творчы складнік і універсальнасць нашых спецыялістаў. У нас кожны журналіст — гэта самастойная «баявая» адзінка, якая можа рабіць усё, пачынаючы з пошуку тэмы і яе распрацоўкі і заканчваючы мантажом і выдачай прадукту ў эфір. Нашы кадры можна закінуць у любое месца планеты, і пастаўленыя задачы будуць выкананы. А ў Германіі кожны адказвае за сваю частку працы.

**— Вы прыйшлі на тэлебачанне праз кастынг. Ці адрозніваецца сёння шлях на экран для прэтэндэнтаў?**

— Так, гэта было даўно, у 2003 годзе. Я прыйшла сюды, бо мая навуковая кіраўніца параіла паспрабаваць сябе. Прайшоўшы ўсе этапы кастынгу — ад размовы да проб перад камерай, я атрымала прапанову павучыцца тут. А потым мяне запрасілі працаваць...

Цяпер я часам уваходжу ў склад каманды, якая глядзіць і адбірае новых людзей на кастынгах. Тут выбіраюць нас і выбіраем мы. Схема такая: журы, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі розных дырэкцый і рэдакцый (яны прафесіяналы), займаецца пошукам і аглядам тых, хто можа прэтэндаваць на шанц трапіць на тэлебачанне. Перш за ўсё мы глядзім на знешнасць, пішам кастынгі на камеру, каб зразумець, як чалавек трымаецца ў такіх умовах, ці «любіць» яго камера. І, галоўнае, ставім пытанні. Класічнае — хто такія Ягораў і Кантарыя.

**— Калі глядзяць на знешнасць, то ці лагічна дапускаць, што вядучы — гэта проста карцінка?**

— Карцінка мае важнае значэнне не толькі ў вобразе вядучага, але і на тэлебачанні наогул. Гэта датычыцца ўсяго, што трапляе ў камеру — людзі, дзеянні, дэталі. Я не кажу, што чалавек павінен быць прыгожым. Тут размова ідзе пра тое, наколькі ён тэлегенічны, харызматычны. Безумоўна, яму не абавязкова быць Брэдам Пітам, каб трапіць у кадр. Але чалавек павінен добра выглядаць, гаварыць, гучаць і, прабачце за банальнасць, быць разумным. Здаецца, быццам тут усё само сабой зразумела, аднак не ўсё проста, бо змест надзвычай важны. І таму нават пры выдатным знешнім выглядзе, але адсутнасці належнай эрудыцыі, я вымушана буду чалавека расчараваць... Той, хто жадае працаваць на інфармацыйнай прасторы, павінен шмат усяго ведаць. Я сама працягваю вучыцца штодня.

**— Прафесійнае майстэрства вы спасцігалі ў «палявых» умовах, адразу на справе...**

— Калі прыходзіш у каманду АТН, то тут ад кожнага спецыяліста (аператара, з якім едзеш на здымкі, ад шэф-рэдактара, ад свайго кіраўніцтва) атрымліваеш карысныя і патрэбныя парады, на іх і вучышся. Працэс навучання няспынны. Хоць на першых парах ты прыходзіш і глядзіш на ўсё вялікімі вачыма: здаецца, быццам тут размаўляюць на нейкай «птушынай» мове, якую табе не зразумець. Тады галоўнае — унікаць у сутнасць усяго, што не зразумела. Я спачатку шмат усяго запісвала...

**— Пачыналі таксама з працы карэспандэнта?**

— Калі так пачынаюць, то гэта правільны шлях, а ў мяне быў іншы. Я прыйшла, калі шукалі новыя твары. І мяне выбралі з 700 прэтэндэнтаў, а пасля ўсіх проб і навучання, як кацяня, кінулі ў працу. Трэба сказаць, што тэлебачанне — гэта тая сфера, дзе ўсё вельмі індывідуальна: калі не ты сам, то ніхто цябе не ўратуе. Праз тры месяцы я ўжо вяла вячэрнюю праграму. Такое рашэнне кіраўніцтва для мяне было нечаканым, хоць і прыемным. Хвалявалася. На маю думку, сёння я ўжо ведаю працэс. Правільна — прыйсці і вучыцца тут усяму з пачатку: робіш сюжэты, вучышся з'яўляцца ў кадры, разбіраешся, што і да чаго, а потым садзішся ў лодку і плывеш з камандай. А ў маім выпадку першы час каманда крыху налягала на вёслы за мяне, падказвала, выцягвала. Потым ужо і на здымкі пачала ездзіць, рабіла свае дакументальныя фільмы...

**У нас кожны журналіст — гэта самастойная "баявая" адзінка, якая можа рабіць усё, пачынаючы з пошуку тэмы і яе распрацоўкі і заканчваючы мантажом і выдачай прадукту ў эфір. А ў Германіі кожны адказвае за сваю частку працы.**

**— Давялося нечым ахвяраваць дзеля працы ў кадры?**

— Мне ўсе гавораць, што я працаголік і ахвярую сваім часам. На што магу адказаць, тут я знайшла сваю нішу, дзе магу аддаваць свой час. Калі гаварыць пра знешнасць, то таксама не змянілася нічога радыкальна. Наогул вельмі спакойна стаўлюся да свайго знешняга выгляду. Ты з'яўляешся на экране — значыць, павінен выглядаць добра і да месца. Гэта твая частка працы — яна настолькі ж важная, як і тое, што ты гаворыш у кадры.

**— Два гады таму вы сталі намеснікам дырэктара Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі. Як вам у ролі кіраўніка?**

— Па-рознаму. Я перагледзела свой графік і знайшла, здаецца, баланс паміж працай, спортам і асабістым жыццём. Пачынала працу знізу, таму ведаю, як і што робіцца. Часам хочацца кожнага свайго супрацоўніка адстойваць перад вышэйшым кіраўніцтвам, таму, магчыма, мне было б не лішне навучыцца быць менш запальчывай у гэтым сэнсе, але наўрад ці ў мяне атрымаецца. Тут працуюць людзі, з якімі не засумуеш. У тых, хто прыходзіць на тэлебачанне, могуць быць розныя матыватары, а для мяне галоўнае, каб не было сумна. Спадзяюся, што як кіраўнік я дастаткова строгая, але творчым людзям неабходна даваць прастору для манеўру.



**— Вы паспяховая, моцная і жыццярадасная. А бываюць моманты, калі адчуваеце сябе слабай жанчынай?**

— Жанчыне такія моманты проста неабходныя. Гэта ж у нашай прыродзе, мабыць — быць недзе не самастойнымі, умець праяўляць цярпенне. І ў мяне такія хвіліны бываюць вечарамі. Калі хочацца, каб табе заварылі чаю і ўкруцілі ў цёплы плед. Пашчасціла мне і на рабоце, бо побач працуюць сапраўдныя мужчыны, таму можна часам пабыць дзяўчынкай. Прыйсці і сказаць: дапамажыце мне. І гэта зробяць: цябе ўратуюць, і ўсё будзе ў парадку.

**Алена ДРАПКО.**

---

■ Тэлесеткі

## Штосьці «ікрамётнае»

**Памятаеце, як герой фільма «Іван Васільевіч мяняе прафесію» прадстаўляў на «царскім банкеце» меню? «Ікра чорная! Ікра чырвоная! Ікра заморская, баклажанавая!». А вось беларускія тэлевізійнікі ў новым сезоне назбіралі ікры айчыннай, інфармацыйнай — з найбольш яркіх і «смачных» падзей, якія адбываюцца ў так званым свецкім жыцці.**



Забаўляльны прадукт, які з гэтага атрымаўся, так без лішніх разваг і назвалі: «Ікра», а прадстаўляць яго ў суботнім эфіры тэлеканала «Беларусь 2» запрошаны вядомыя па здымках у тэлешоу Івана Урганта і леташнім адборы на «Еўрабачанне» блізняты Дар'я і Вольга Кароль.

Карміць наведнікаў свецкай тэлекухні абяцаюць гарачым і смажаным: навінамі шоу-бізнесу, рэпартажамі з гучных тэатральных прэм'ер, выстаў і прэзентацый, эксклюзіўнымі інтэрв'ю з вядомымі артыстамі і г. д. Напрыклад, у першым выпуску карэспандэнты «Ікры» прарваліся ў грымёрку да спявачкі Святланы Лабады і распыталі яе пра вельмі і вельмі асабістыя рэчы, а таксама пабывалі на дабрачынным канцэрце ў падтрымку прадзюсара Максіма Алейнікава і высветлілі, як ужываюцца на адной сцэне розныя склады гурта «Топлес» і колькі грошай беларускія артысты гатовы самі ахвяраваць на дабрачыннасць...

Усе наступныя порцыі — прабачце, выпускі праграмы — як абяцаюць яе стваральнікі і абаяльныя вядучыя, будуць не менш насычанымі і цікавымі. Праверыць гэта нескладана: кожную суботу ўвечары на «Беларусь 2». Смачна есці!

## СВЕТ ЗНАЁМЫ, ДЫ НЕВЯДОМЫ

**Веды пра прыроду не толькі важныя, але і неверагодна цікавыя, — гэты прынцып стваральнікі навукова-папулярнага шоу «Terra Incognita» ўвесь час пацвярджаюць на практыцы. Так, у кастрычніку праграма запрашае гледачоў у захапляльную вандроўку па «беларускім Шэрвудзе», правядзе на самым доўгім мосце ў свеце і раскажа, што такое бёрдвотчынг.**

«Калі вы лічыце, што ведаеце пра Гродна — горад-помнік, горад-музей пад адкрытым небам — усё, то варта ад'ехаць на 15–20 кіламетраў ад яго, каб зрабіць для сябе мноства адкрыццяў», — запэўнівае вядучы Максім Немчынаў. Напрыклад, акрамя славутага Аўгустоўскага канала, у старажытнай Гродзенскай пушчы ёсць і рэчы, зусім не вядомыя шырокай публіцы, сярод якіх — мост, што лічыўся некалі самым доўгім у гісторыі чалавецтва (каб яго праехаць, патрабавалася 13 дзён!).

Далей здымачная група праграмы завітае ў іншы рэліктавы лес — Налібоцкую пушчу, якую многія даследчыкі лічаць радзімай краманьёнцаў — і, па чутках, некаторыя з іх і сёння хаваюцца ў лясным гушчары. Акрамя таго, Максім Немчынаў, як эколаг-арнітолаг па адукацыі, не абміне ўвагай першы ў Беларусі чэмпіянат па фатаграфаванні птушак і не толькі раскажа больш падрабязна пра папулярны ва ўсім свеце бёрдвотчынг, але і пазнаёміць гледачоў з гэтым хобі, так бы мовіць, знутры.

Паглядзець на родныя мясціны па-новаму разам з «Terra Incognita. Беларусь невядомая» можна кожную пятніцу ў 17.20.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ПАЛІТРА ПАЧУЦЦЯЎ

## Чэшскія колеры расійскага мастака душой і сэрцам прыгарнуліся да Беларусі

**Мастацкі свет заўсёды непрадказальны. Мастакі здаўна падарожнічаюць, шукаючы новых уражанняў. Невыпадкова перадзвіжнікі ехалі на доўгія вакацыі ў Еўропу. Як невыпадковым здаецца жаданне, напрыклад, Георгія Паплаўскага адкрываць Індыю, Кітай, Егіпет... Нават Кітай, у якім ужо можна стварыць мастацка-геаграфічны атлас беларускай скульптуры, вабіць шукальнікаў мастацкіх ісцін. Альбо ўражлівым падаецца «наступ» сучасных беларускіх мастакоў на Германію, Францыю, іншыя краіны. У 1960-я і пазней савецкія мастакі (былі сярод іх і прадстаўнікі беларускай мастацкай школы, як сёння славуты жывапісец Барыс Забораў, якому ў Мінску цесна было ўседзець у «пасадзе» кніжнага графіка) імкнуліся вырвацца на вольнае паветра ў іншы свет. З кагорты такіх па-свойму рашучых і адважных і санкт-пецярбургскі творца Барыс Кюленен.**



Фота Наталлі АСМОЛЫ.

Атрымаўшы адукацыю ў Маскоўскім паліграфічным інстытуце, ён працаваў рэстаўратарам у Ленінградзе. Вядома ж, для поўнай яго рэалізацыі як мастака шмат чаго не ставала. Было жаданне вырвацца «за рамкі». Паспрыяла гэтаму і нечаканае каханне. У горад на Няве прыехала чэшская мастачка Бажэна Двожакава. Яна марыла пабываць у Эрмітажы. Але трапіла да гэтай скарбніцы ў выхадны дзень. На працу ішоў Барыс і сустрэўся позіркам з сумнымі вачыма замежнай госці. І не мог не правесці для яе экскурсію па пустых залах Эрмітажа. Так нарадзілася каханне. Усё адбылося імкліва. Бажэна развялася з мужам, запрасіла Барыса ў Чэхаславакію (так тады называлася яе краіна). Але... яго не выпусцілі. Бажэна правяла юрыдычныя кансультацыі, раілася з натарыусам. І як вынік — яны распісаліся ў ЗАГСе ў Ленінградзе, а ў чэшскі Тржэбіц паехалі як муж і жонка. І быў гэта 1980 год...

Шчаслівыя сужэнцы Кюленены засвналі мастацкую галерэю, на другім яе паверсе зрабілі жылыя пакоі. Шмат працавалі. Арганізоўвалі выстаўкі, ездзілі літаральна па ўсім свеце. Барыс Кюленен спраўдзіўся не толькі як рэстаўратар, але і як жывапісец, кніжны графік, фотамастак... Цяпер ён з ахвотай сваімі творамі вяртаецца ў знаёмую яму постсавецкую прастору. Так здарылася, што яго выстаўка графічных работ прайшла ў «Кніжным салоне» ў Мінску. Як куратар гэтага праекта і мінскі куратар чэшскай галерэі GalerieKARAS выступіла мастачка, кніжны графік Аксана Аракчэева. Сам аўтар работ не змог прыехаць з чэшскага Тржэбіча. Але яго віталі многія зацікаўленыя ў развіцці чэшска-беларускіх мастацкіх і культурных стасункаў асобы. І старшыня таварыства «Беларусь — Чэхія» Валерый Гедройц, і намеснік старшыні беларускага Саюза мастакоў Аляксандр Дранец, і паэт Сяргей Панізнік, даўні прыхільнік чэшскай культуры, перакладчык многіх твораў чэшскіх паэтаў на беларускую мову.

Усе яны пранікліва, з пачуццём асаблівай сардэчнасці гаварылі пра колеры, вынайдзеныя Барысам Кюлененам у распаведзе пра Чэхію, Маравію, Тржэбіч, розныя цікавыя яму тэмы. Палітрай пачуццяў я назваў бы ўсе мастацкія знаходкі чэшскага творцы. І хоць ён не прыехаў на імпрэзу ў «Кніжны салон», здавалася, што размову з гледачом вядуць яго душа і сэрца.

— У многім сённяшняя выстаўка адбылася дзякуючы руплівасці колішняга чэшскага пасла ў Беларусі Іржы Караса, які настойліва цяпер прапагандуе ў Чэхіі беларускае выяўленчае мастацтва, робіць цяснейшымі мастацкія сувязі дзвюх славянскіх краін. Дарэчы, напрыканцы сваёй дыпламатычнай місіі Іржы Карас у 2011 годзе быў выбраны ганаровым членам Беларускага саюза мастакоў. Такое званне прысуджана было ўпершыню. І цяпер добры сябар Беларусі не забывае пра сваю захопленасць творчымі адкрыццямі нашых жывапісцаў, графікаў. Сведчанне гэтаму і тое, што Galerie KARAS у 2013—2014 гг. правяла чатыры беларускія выстаўкі. А ў сёлетнім лістападзе яна прапаноўвае свае залы для вернісажа беларускіх скульптараў «Шляхам Скарыны да Прагі». Імпрэза ж у мінскім «Кніжным салоне» — адзін з першых крокаў да асваення чэшскага мастацкага свету ў Беларусі.

**Сяргей ШЫЧКО**

# СВЕДЧАННЕ ПАМЯЦІ

## У Мінску падтрымалі ініцыятыву Еўразійскага збору артэфактаў Другой сусветнай

**Напярэдадні 70-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў беларускія распрацоўшчыкі папулярнай камп'ютарнай ваеннагістарычнай гульні «Свет танкаў» (World of Tanks) арганізавалі аўтапрабег «Уладзівасток (Расія) — Брэст (Францыя)». Галоўнай мэтай мерапрыемства стаў збор калекцыі экспанатаў часоў Другой сусветнай вайны. На гэтым тыдні ўдзельнікі аўтапрабегу спыніліся ў Беларусі.**

Аўтапрабег стартаваў 22 жніўня ва Уладзівастоку, і ўдзельнікі ўжо прарабілі шлях даўжынёй 13 000 км з Уладзівастока да Мінска і правялі ў дарозе больш за 40 дзён. Увесь маршрут аўтапрабегу будзе доўжыцца каля двух месяцаў і фінішуе ў французскім Брэсце. У рамках акцыі ўжо было арганізавана 18 сустрэч, на якія прыхільнікі World of Tanks і ўсе ахвотныя прынеслі больш за 50 адзінак памятных рэчаў ваеннай эпохі з асабістых архіваў — фотаздымкі, медалі, лісты або іншыя атрыбуты ваеннага побыту. Яны будуць перададзены ў ваенна-гістарычныя музеі. Вось некаторыя з гісторый з вуснаў удзельнікаў аўтапрабегу.

**Яўген Нігматулін (медаль «За ўзяцце Кёнігсберга», ордэн Айчыннай вайны другой ступені):**

*— Недалёка ад майго дома стаялі тры нежылыя драўляныя дамы, тры баракі. Потым два з іх знеслі, а адзін згарэў. Мне было гадоў дванаццаць, калі мы з сябрамі лазілі па гэтым пажарышчы, і там я знайшоў гэтыя ордэн і медаль. Я не ведаю, каму яны належалі, для мяне яны так і засталіся безыменнымі. Гэта было занадта даўно да мяне, каб высветліць, хто там жыў, і бацькі мае, і сваякі таксама не ведаюць. Але гэтыя ўзнагароды не мае, і я не маю права трымаць іх у сябе, хай яны захоўваюцца ў музеі.*

**Вадзім Кулакоў (медалі «За ўзяцце Берліна» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.»):**

*— Цапенка Мітрафан Васільевіч — мой прадзед па матчынай лініі, украінец. Ён пайшоў на фронт у 1941 годзе, быў кулямётчыкам, атрымаў раненне — прастрэлілі лёгкае. Потым павінны былі камісаваць, але ён прыняў рашэнне паехаць на Уралвагонзавод, дзе нароўні са звычайнымі слесарамі збіраў танкі Т-34. А потым на гэтых танках і пайшоў ваяваць зноў: быў створаны Уральскі добраахвотніцкі танкавы корпус. Ён дайшоў да Берліна, іх экіпаж браў Рэйхстаг. Я хачу, каб не толькі я глядзеў на гэтыя медалі, але і ўся краіна глядзела на іх і памятала сваіх герояў.*

**Сяргей Карпаў (кабура):**

*— Гэта нямецкая кабура 1943 года ад парабелума. Дасталася яна мне ад цесця: ён служыў у заходняй групе войскаў, і, відаць, яна трапіла яму ў рукі ў Германії. Ён мне яе перадаў, а мне яна без патрэбы. Я вырашыў, што вам больш патрэбна — вы робіце добрую справу, і гэтая кабура яшчэ спатрэбіцца як экспанат у музеі (на шчасце, не па прамым прызначэнні).*




**Павел Хахракоў (медаль «За перамогу над Японіяй):**

*— Медаль захоўваўся ў мяне дома. Мне здаецца, з рэчамі такое часта адбываецца: яна ў цябе ёсць, а адкуль, ты ўжо не памятаеш. Абодва мае прадзеды ваявалі ў Другую сусветную, а ў майго сябра захаваліся лісты, якія яго прадзед пісаў дадому. Я хачу перадаць медаль у музей — калі ён там будзе захоўвацца, то гэта будзе не баявая ўзнагарода, але сведчанне памяці. Вядома, хацелася б даведацца яе гісторыю, але гэта ўжо немагчыма...*

У кожным горадзе па маршруце аўтапрабегу яго ўдзельнікі прыязджаюць на сустрэчу з распрацоўшчыкамі на асабістым аўто, пераробленым з падручных сродкаў у «танкамабіль». Мінск не стаў выключэннем.

Мерапрыемства было арганізавана ў рамках праграмы «Памятаем усё». Гэта глабальная ініцыятыва кампаніі Wargaming, якая была пачата ў канцы 2013 года і накіравана на садзейнічанне ваенна-гістарычным музеям па ўсім свеце ў справе захавання і рэстаўрацыі легендарных узораў ваеннай тэхнікі. Кампанія павінна адрадзіць цікавасць да гісторыі, натхніць моладзь на вывучэнне мінулага сваёй краіны і захаваць для будучых пакаленняў унікальныя гістарычныя помнікі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ЖЫЦЦЁ НАВЫВАРАТ

## З-за ўключанай на гаджэце камеры яно ў адзін момант можа стаць зусім не асабістым і далёка не прыватным

СТУДЭНТКА медкаледжа ў Казані прагнула славы — і яна яе займела. Праўда, падазраю, зусім не такую, аб якой марыла: яе выключылі з навучальнай установы, цяпер стаіць пытанне аб завядзенні на яе крымінальнай справы. Хаця ў нейкай ступені яна сваёй мэты дасягнула: у інтэрнэце на яе старонцы — тысячы праглядаў. Яно і не дзіва: дзяўчына выклала ў сацыяльнай сетцы фота з аперацыі, падчас якой яна была асістэнткай. Няспраўджаная медсястра вельмі дэталёва ў каментарыях апісала траўмы псіхічна хворай пацыенткі, якая выпала з акна шматпавярховага дома, а на фота пазіравала... з органамі гэтай самай пацыенткі ў руках.

Сюжэт — сапраўдная знаходка для журналістаў. Адны кінуліся ў той каледж, і зляканае кіраўніцтва рапартуе ў камеру, што ўсе будучыя медспецыялісты пройдуць псіхалагічнае тэсціраванне на прадмет выканання элементарнай прафесійнай этыкі (цікава, як яны будуць высвятляць, гатовы санітар ці медсястра фатаграфавацца на фоне хворага або пакалечанага чалавека ці не?). Другія тыкаюць мікрафонам у твар праваабаронцам, і тыя з энтузіязмам тлумачаць, што чалавек за падобныя дзеянні павінен падвяргацца самаму сур'ёзнаму пакаранню. Трэція запрашаюць у студыю псіхолага, і той пераканаўча разважае аб праблемах, якія ў раннім дзяцінстве адбіліся на цяперашніх паводзінах той «зоркі» інтэрнэту.

ШЧЫРА кажучы, з усіх эмоцый, якія прыйшлі ўслед за гэтай інфармацыяй, самай моцнай было, бадай што, не абурэнне. Яно, канешне, было, як, напэўна, і ў кожнага нармальнага чалавека, але вельмі хутка саступіла месца страху. Як той казаў, прэцэдэнт — і не адзінкавы, калі паглядзець на тое, што творыцца ў сусветнай смятніцы пад назвай «сацыяльныя сеткі», — меў месца. Гарантыі, што твой стаматолаг ці, выбачайце, дамскі доктар не акажацца маральным вычварэнцам, абдзеленым увагай, які хоча займець гэту самую ўвагу хай сабе хоць у віртуальным свеце, няма ніякай. Выходзіць, нават засынаючы пад наркозам, расслабляючыся на масажы ці прыходзячы на прымерку ў атэлье, трэба быць вельмі пільным, бо смартфон ці айфон у пакоі — павышаная небяспека для асабістага прыватнага жыцця, якое з-за ўключанай на гаджэце камеры ў адзін момант можа стаць зусім не асабістым і далёка не прыватным...

Пра мараль тут размову весці ўвогуле бессэнсоўна — глабальнае сеціва — тэрыторыя, вольная ад маралі. Гэтаксама як і пра адказнасць, фінансавую або крымінальную, вялікая верагоднасць якой можа прымусіць задумацца тых, хто спрабуе дзеля ўласнай аднамінутнай славы напаскудзіць іншаму. «Інтэрнэт — гэта як плот, на якім напісана непрыстойнае слова: усе, хто ідзе міма, чытаюць, але ніхто не ведае дакладна, хто яго напісаў»... Гэтыя словы я пачула гадоў пятнаццаць назад ад шаноўнага прафесара Ясера Засурскага, які ўжо тады, на світанку глабалізацыі інфармацыі разумеў і папярэджваў, што яна за сабой пацягне. Нічога не змянілася, толькі да слоў на «плоце» дабавіліся непрыстойныя карцінкі, аўтарства якіх вылічыць проста немагчыма. Калі, вядома, сам аўтар гэтага не пажадае...

АЛЕ ж жадаюць! Дзяўчына, што зладзіла фотасесію ў аперацыйнай, не ўтойвала свайго імя, наадварот — яна хацела сабраць як мага большую колькасць «лайкаў» на свае крывавыя здымкі. Гэткая віртуальная публічнасць характэрная больш для падлеткаў, абдзеленых увагай блізкіх людзей, гавораць псіхолагі. Вывернуць жыццё — сваё або чужое, не важна, — перад шматмільённай аўдыторыяй імкнуцца недалюбленыя ў сям'і дзеці, да якіх няма справы самым родным людзям. Але ж гэта робяць і разумныя дарослыя — і іх віртуальныя ўчынкі часам зусім нельга патлумачыць і зразумець. Спецыялісты-»мазгаведы» тут таксама катэгарычныя: гэтыя дзядзькі і цёткі, што прагнуць публічнасці, — тыя самыя недалюбленыя дзеці, якія проста выраслі.

У такім выпадку ёсць чаго баяцца нам усім. Бо хутка вырастуць нашы дзеці. Якім ужо ў паўтара-два гады, каб адчапіцца, уключаем камп'ютар ці планшэт — разумную тэхніку, што, на нашу радасць, вельмі добра спраўляецца з абавязкамі нянькі. (А калі задумацца — нядрэнна замяняе і нас саміх.) З кім гэтыя дзеці будуць дзяліцца перажываннямі, горам, радасцю, нязіраннямі — з татам і мамай, вечна занятымі сваімі справамі? Або з самым надзейным сябрам, які паказвае цікавыя мульцікі, спявае песні, расказвае казкі? У якім, як выявіцца крыху пазней, — мільён гэткіх самых сяброў, што шукаюць любові і ўвагі ў віртуальным свеце, не атрымаўшы гэтых простых рэчаў у рэальным...

... НЯДАЎНА з прыяцелем пайшлі ў тэатр. Спектакль быў цікавы, пагаварыць пасля было пра што. Ды не ўдалося: выйшаўшы на вуліцу, ён адразу ўключыў планшэт і пачаў на сваёй віртуальнай старонцы пісаць паведамленне аб сваім культурным паходзе, уражанні, размяшчаць фота... На ўсе мае спробы загаварыць адмахваўся: пачакай, маўляў, гэта ж тэрмінова. Махнуўшы рукой, я пакінула яго сам-насам з любімым суразмоўцам (сумняваюся, што ён гэта заўважыў). Назаўтра ён пазваніў, прасіў прабачэння, запрашаў да сябе ў госці на келіх віна. Адмовілася: зусім не хачу, каб пра тое, якое мы пілі віно, даведаўся ўвесь свет.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# БУЛЬБА, ЯБЛЫКІ, КАМЕННЕ,

## або «Сельгасрамантыка» колішніх школьнікаў і студэнтаў

**Цікава, ці адпраўляюць цяпер школьнікаў на дапамогу вёсцы? Калі мы шчыравалі на агародзе, братава пытанне ў кантэксце гутаркі прагучала неяк нечакана, але тут жа стала тэмай успамінаў. Не ўсе з цяперашняй моладзі, мабыць, здагадаліся, пра што ідзе гаворка...**
**Насамрэч для пакаленняў тых, каму зараз ад 30 і больш, такія «працоўныя семестры» былі некалі пастаяннымі і будзённымі падчас вучобы ў школе, вучылішчы, універсітэце. Ледзь пачаўшы новы навучальны год, ці не праз тыдзень пасля першай лінейкі, школьнікаў накіроўвалі на дапамогу тагачасным калгасам і саўгасам. Сельскагаспадарчыя работы доўжыліся недзе месяц, бывала, быў перапынак, а потым яны тыдні на два аднаўляліся ў кастрычніку. А ўвогуле гэта залежала ад таго, што дапамагалі збіраць вяскоўцам. Вядома, на капусту «кідалі» пазней.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

...РАНКАМ вучні сярэдніх і старэйшых класаў пакрысе пачыналі збірацца каля ганка школы, не заходзячы ў будынак, калі дазваляла надвор'е. З цікавасцю пасля аднолькавай школьнай формы разглядалі адно аднаго. Кожны апранаўся для працы ў полі на свой капыл: хто ў куртку, хто ў ватоўку; у аднаго кепка, у другога — вязаны «пеўнік». Боты на нагах — абавязкова ва ўсіх. У каго бацькоўскія «кірзачы», у каго больш «далікатныя» гумавікі. Абавязкова неслі з дому ўласныя прылады працы: вядро або кошык, рыдлёўку ці нож, калі было патрэбна. На дне вядзерца або ў кішэні курткі «тармазок»: некалькі яблыкаў, бутэрброды. Машыну чакалі, седзячы купкамі на тых самых перакуленых вёдрах.

**Бярэш вядро з бульбай, накрываеш яго саломай, перакульваеш і ставіш на вуголле. А зверху зноў дроў. Праз нейкі час гатова печаная страва — на ўсю групу!**

Развозілі «працоўны дэсант» па палях звычайна на бартавых «ГАЗах» з невялікімі навесамі. У кузаве — шэраг драўляных лавак упоперак, на заднім борце — лескі. Хлопцы падсаджвалі або зверху падавалі руку дзяўчатам. Часам былі яшчэ такія аўтобусы з адной пярэдняй дзверцай, якую пры дапамозе рычага адчыняў з кабіны кіроўца. Яшчэ радзей трапляліся «ПАЗікі».

Поле ранкам, як правіла, сустракала або расой, або туманам ці ўжо нават інеем. Боты імгненна пачыналі блішчэць ад вільгаці. Рады з бульбай, морквай ці буракамі знікалі недзе ўдалечыні... Брацца за мокрае бацвінне, кранаць такія ж караняплоды на золкім паветры вой як не хацелася... Мільгала нават думка пра цёплы школьны клас. Галоўным, нацягнуўшы на рукі будаўнічыя спяцоўкі ці старыя пальчаткі, было пачаць. Ужо праз паўгадзіны, крыху разагрэўшыся і бачачы плён першых высілкаў, станавілася лягчэй. А там і туман знікаў, сонейка пачынала пакрысе прыпякаць у спіну. Праз якіх пару гадзін скідалі ў кучу ватоўкі.

Калі выбіралі пасля камбайна бульбу, хлопцы звычайна насілі да машыны кошыкі і вёдры, хоць і дзяўчатам даводзілася. «Казырнай» працай было з кузава прымаць тару і высыпаць сабранае, таму караскаліся туды па чарзе. Ахвотныя былі нават сярод аднакласніц. Калі абразалі бацвінне сталовым або кармавым буракам, моркве, звычайна міні-брыгадай накідвалі кучу караняплодаў, а потым абсеўшы яе, «чыкалі» ножычкамі. Па камандзе настаўнікаў рабілі невялікія перапынкі, можна было падсілкавацца. Пасля гэтага распачынаць працу на сонцы зноў было цяжкавата. Заўсёды знаходзіліся аднакласнікі, якія пачыналі дурэць, цягнуць час, абы толькі не працаваць. Тут ужо, паколькі працавалі невялікімі купкамі, на такіх хітруноў распаўсюджвалася «калектыўнае выхаванне».

ЯК, выбіраючы моркву, было не паласавацца ёю? Праўда, часам траплялася кармавая, зусім не салодкая. А смак сырога сталовага бурака? Чык-чык з бакоў караняплод, хвосцік — прэч і, як той казаў, зубкамі яго, зубкамі. А забаўкі якія былі! Разрэзаў папалам бурак, ціхенька падкраўся да якой аднакласніцы і — да шчок тыя кавалкі! І абавязкова ж трэба было кінуць з «Марозкі»: «Не, не прынцэса... Каралеўна!» Але дзяўчаты сцерагліся нас, падкрасціся было няпроста. Часам яны і самі маглі наладзіць вылазку ў адплату. Забаўляліся яшчэ і тым, што падчас перапынкаў выразалі з бурака пячатку, а потым самі сабе ставілі чырвоныя адбіткі розных фігурак на руках... З працы, калі ад школы да таго поля было некалькі кіламетраў, пасля ішлі з жартамі і «шпількамі» пехатою, расцягнуўшыся невялікімі купкамі ад самай «магілёўкі». Хто хацеў, дазвалялася набраць вядзерца морквы ці бульбы, буракоў дадому.

...А яшчэ і ўвесну, і ўвосень хадзілі «на каменне». Расцягнуўшыся ланцужком за машынай ці трактарам, марудна брылі па полю, вышукваючы іх, каб потым сельскагаспадарчая тэхніка не пашкодзіла навяснoe абсталяванне. Заўважыў, падабраў, кінуў у кузаў або прычэп. Вялікія валуны падносілі да транспарту ў некалькі рук. Адзін круг, другі... А камяні ўсё «растуць». Потым кіроўца адвозіў іх і апаражняў загружаны кузаў недзе на ўскрайку поля. Каму трэба было па гаспадарцы, мог пад'ехаць і набраць. Цяпер іншыя часіны. Сапраўдны бум будоўлі ў вёсках, да таго ж многія хочуць не проста агароджу на ўчастак, а каб слупы або падмурак да яго былі абавязкова з валуноў! Зноў жа на ўчастку якую кампазіцыю з камянёў выкласці, басейн ці альпійскую горку аздобіць. Цяпер — гэта вам не калісьці. Чуў, што на камяні «палююць», а ў некаторых рэгіёнах адзін час з вуснаў кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў нават гучалі прапановы мэтанакіравана зарабляць на ахвотных набыць для ўласных патрэб валуны. Можа, і зарабляюць?..

